**Алімпіядныя заданні па беларускай літаратуры**
**для вучняў 5 класа**

**Ірына Уладзіміраўна Цімохава**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
гімназіі г. Быхава

**Прапанаваныя заданні прызначаны для падрыхтоўкі вучняў да рэспубліканскай алімпіяды па прадмеце "Беларуская літаратура" на II ступені навучання.**

**Заданні можна выкарыстаць на падагульняючых уроках па літаратуры, пры правядзенні прадметнага тыдня, пры падрыхтоўцы да алімпіяды па прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура", прапанаваць вучням у якасці дамашняга задання, прымяніць падчас розных пазакласных мерапрыемстваў: віктарын, конкурсаў, турніраў.**

**Заданне 1.** Адкажыце на пытанні:

1. З якой мовы паходзіць слова "літаратура"?
2. Якую жывёлу, на думку Уладзіміра Караткевіча, нагадваюць абрысы 

Беларусі?
3. Калі ў свеце адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы?
4. Якія шчырыя і ветлівыя словы прыгадвае П. Броўка ў наступных радках?

У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: "_______________!"

5. "Жаўруковая музыка", якая чуецца "ў скошаных травах мурожных" у вершы Яўгеніі Янішчыц, − гэта……
6. Які час сутак апявае Анатоль Грачанікаў у вершы "Дрымотна ціснуцца кусты"?
7. Назавіце аўтара наступных радкоў: "Я хачу вас правесці па зямлі, якая для мяне – і, мабыць, не толькі для мяне – даражэйшая за ўсё, самы ўтульны і чароўны кут. Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў, светлыя ад бяроз гаі, што аглухлі ад птушынага звону, і пушчы, дзе горда нясуць свае кроны алені".
8. Якая птушка з'яўляецца сімвалам Беларусі?
9. Якое слова прапушчана ў радках верша У. Караткевіча?

Мой чароўны беларускі край,

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

……………………     светлая     мая!



10. Хто з’яўляецца аўтарам карціны “Мая Беларусь”?

**Заданне 2**. Па прапанаваных ілюстрацыях пазнайце казкі, запоўніце табліцу.

| Малюнак да казкі | Назва казкі | Разнавіднасць казкі |
|---|---|---|
|  1. | | |
|  2. | | |
|  3. | | |

**Заданне 3.** Узнавіце літаратурныя тэрміны па апісанні.

1. Вобразнае апісанне ўтоенага прадмета ці з’явы, якое патрабуе разгадкі –………
2. Фантастычнае апавяданне, заснаванае на паэтызацыі гістарычных падзей і ўслаўленні народных герояў –………
3. Вусная народная творчасць, творы невядомых аўтараў, што бытуюць у народзе ў вуснай форме –………
4. Займальны аповед пра неверагодныя і фантастычныя падзеі і прыгоды –………
5. Вусны народны аповед, заснаваны не на жыццёвым вопыце, а на фантазіі, выдумцы, часам на містыцы –………
6. Мастацкае азначэнне, якое вобразна (жыва, наглядна, паэтычна) характарызуе прадмет, з’яву, чалавека –………
7. Трапнае народнае выслоўе, у якім прадказваецца пэўны вынік, пацверджаны шматвяковым народным вопытам –………
8. Размова дзвюх або некалькіх асоб у мастацкім творы –………
9. Устойлівая формула, з якой пачынаецца казка –………

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

10. Трапнае народнае выслоўе, часцей з павучальным зместам, якое дае вобразную ацэнку чалавечым паводзінам, учынкам, якасцям –………

**Заданне 4**. Запоўніце табліцу.

| Аўтар | Назва твора | Жанр | Герой(і), вобразы |
|---|---|---|---|
| | | | Дачка, бацька, пан |
| | “Ля вогнішч начлежных” | | |
| Герых Далідовіч | | | |
| | | | Пятро, Гнат, велікан |
| | “Пестунь” | | |
| Максім Багдановіч | | | |
| | | | Сяргей, Бурык |
| | “Музыкі” | | |
| | | | Міколка |
| | “Дарэктар” | | |

**Заданне 5**. Устанавіце адпаведнасць паміж словамі і іх лексічным значэннем. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле.

| | | | |
|---|---|---|---|
| А | Золак | 1 | Прыстаўная лесвіца |
| Б | Драбіны | 2 | Здагадлівасць, востры розум |
| В | Брама | 3 | Вялікая чорная драпежная птушка |
| Г | Рэшата | 4 | Народны музычны інструмент |
| Д | Кемлівасць | 5 | Пачатак світання |
| Е | Поплаў | 6 | Дзікая расліна |
| Ж | Крумкач | 7 | Луг у пойме ракі |
| З | Жалейка | 8 | Скаварада |
| І | Пустазелле | 9 | Жалезны абруч ад кола ў возе |
| К | Патэльня | 10 | Лёгкая пасудзіна для прасейвання мукі |
| | | 11 | Вароты ў двор дома |

А…, Б…, В…, Г…, Д…, Е..., Ж…, З…, І…, К….

**Заданне 6.** Аднавіце прыказкі. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў.

| | |
|---|---|
| А. Не цані чалавека па твары | 1. … а спраў вяршок. |
| Б. Людзей слухай | 2. … а чалавека праца. |
| В. Слоў мяшок | 3. … а той, хто дае |
| Г. Ваўка ногі кормяць | 4 …. а цані па душы. |
| Д. Не той багаты, хто мае | 5. … а малога павучай. |
| Е. Старога паважай | 6. … а свой розум май. |
| | 7. … а другому не дам. |

А…, Б…, В…, Г…, Д…, Е... .

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

**Заданне 7.** Па прапанаваных цытатах пазнайце, каму яны належаць, укажыце аўтара і назву твора.

| № | Цытата | Чые гэта словы? | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|---|
| 1 | — Наце ж вам... за маці, за сястрычку маю! | | | |
| 2 | — Не, не трэба, — адказаў ён. — Ніякі ўрач, нават прафесар ці акадэмік, мне надта не паможа. Я ў медыцынскім даведніку вычытаў, што мая хвароба невылечная. | | | |
| 3 | — Хватай барзджэй — ды на хлеб, а то ўцячэ ўсё! — закрычаў … на Кастуся, убачыўшы, што ў таго ўвесь тук з сала збягае ў агонь. — Во гэтак, гэтак... — І сам прыціснуў свой скрылёк на хлеб. | | | |
| 4 | — Я адпомсціла, пан, за Андрэйку, за яго бацьку і за ўсіх, хто загінуў ад тваіх рук у тваім маёнтку… | | | |
| 5 | — Уладкуюся на жэрдачцы пад страхой… | | | |
| 6. | – Яшчэ мы пабачым! –….. ўскіпеў<br>І, злосны, каня ён прышпорыў,<br>Панёсся, як прывід, і знік сярод дрэў<br>Старога спрадвечнага бору. | | | |
| 7. | — А чым жа, матуля, гэта кепска? Ну і пайду, і пабягу ў другіх берагах... Скажу табе, родная, мне і самой хацелася паглядзець на другія абшары Божага свету. | | | |
| 8. | — Вось што,— сказаў тады …..,— правільна ён зрабіў, пераступіўшы такі закон. Болей таго не будзе. Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках бацькоў... Кланяйцеся гэтым двум да долу, людзі! | | | |

**Заданне 8.** Уважліва разгледзьце малюнкі-падказкі, пазнайце творы, запоўніце табліцу.

| Малюнак да твора | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|
|  1. | | |

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | | |
|---|---|---|
| 2.  | | |
| 3.  | | |
| 4.  | | |
| 5.  | | |



**Заданне 9.** Якому мастаку слова ўстаноўлены гэты помнік , назавіце горад, дзе ён знаходзіцца.

Адказ:

Мастак слова – ___________

Горад – ______________

АДКАЗЫ

**Заданне 1.**

1. Лацінская
2. Зубр
3. 21 лютага
4. Калі ласка
5. Мова
6. Ноч
7. Уладзімір Караткевіч
8. Бусел
9. Бацькаўшчына
10. Уладзімір Масленікаў

**Заданне 2.**

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

1. “Музыкі”, казка пра жывёл.
2. “Залаты птах”, чарадзейная казка.
3. “Разумная дачка”, бытавая казка.

**Заданне 3.**

1. Загадка.
2. Легенда.
3. Фальклор.
4. Казка.
5. Павер’е.
6. Эпітэт.
7. Прыкмета.
8. Дыялог.
9. Зачын.
10. Прыказка.

**Заданне 4**.

| Аўтар | Назва твора | Жанр | Героі(і), вобразы |
|---|---|---|---|
| народ | “Разумная дачка” | казка | Дачка, бацька, пан |
| Максім Танк | “Ля вогнішч начлежных” | паэма | Галіна, Васілька, Барына |
| Генрых Далідовіч | “Страта” | апавяданне | Стась, Міця |
| Уладзімір Караткевіч | “Нямоглы бацька” | казка | Пятро, Гнат, велікан |
| народ | “Пестунь” | легенда | Парабкі, ваўчанё |
| Максім Багдановіч | “Зімой” | верш | Вечар, зоркі, коні |
| Уладзімір Караткевіч | “Былі ў мяне мядзведзі” | апавяданне | Сяргей, Бурык |
| народ | “Музыкі” | казка | Асёл, сабака, кот, певень |
| Міхась Лынькоў | “Васількі” | апавяданне | Міколка |
| Якуб Колас | “Дарэктар” | урывак з паэмы | Міхал, Яська Базылёў, Уладзь, Костусь, Алесь |

**Заданне 5.**

А5, Б1, В11, Г10, Д2, Е7, Ж3, З4, І6, К8

**Заданне 6.**

А4, Б6, В1, Г2, Д3, Е5.

**Заданне 7.**

| № | Цытата | Чые гэта словы? | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|---|
| 1 | — Наце ж вам... за маці, за сястрычку маю! | Міколка | “Васількі” | Міхась Лынькоў |
| 2 | — Не, не трэба, — адказаў ён. — Ніякі ўрач, нават прафесар ці акадэмік, мне надта не паможа. Я ў медыцынскім даведніку вычытаў, што мая хвароба невылечная. | Міця Бокуць | “Страта” | Генрых Далідовіч |

NG ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3 | — Хватай барзджэй — ды на хлеб, а то ўцячэ ўсё! — закрычаў … на Кастуся, убачыўшы, што ў таго ўвесь тук з сала збягае ў агонь. — Во гэтак, гэтак... — І сам прыціснуў свой скрылёк на хлеб. | дзед Агей | “Цітаўкі” | Анатоль Кудравец |
| 4 | — Я адпомсціла, пан, за Андрэйку, за яго бацьку і за ўсіх, хто загінуў ад тваіх рук у тваім маёнтку… | Нара | “Нарач” | народ |
| 5 | — Уладкуюся на жэрдачцы пад страхой… | пеўнік | “Музыкі” | народ |
| 6. | – Яшчэ мы пабачым! –….. ўскіпеў<br>І, злосны, каня ён прышпорыў,<br>Панёсся, як прывід, і знік сярод дрэў<br>Старога спрадвечнага бору. | Барына | “Ля вогнішч начлежных” | Максім Танк |
| 7. | — А чым жа, матуля, гэта кепска? Ну і пайду, і пабягу ў другіх берагах... Скажу табе, родная, мне і самой хацелася паглядзець на другія абшары Божага свету. | Крыніца | “Крыніца” | Якуб Колас |
| 8. | — Вось што,— сказаў тады …..,— правільна ён зрабіў, пераступіўшы такі закон. Болей таго не будзе. Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках бацькоў... Кланяйцеся гэтым двум да долу, людзі! | Максім | “Нямоглы бацька” | Уладзімір Караткевіч |

**Заданне 8**.

| Малюнак да твора | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|
| 1.  | “Васількі” | Міхась Лынькоў |
| 2.  | “Нямоглы бацька” | Уладзімір Караткевіч |

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА

| | | |
|---|---|---|
| 3.  | “Зімой” | Максім Багдановіч |
| 4.  | “На рэчцы” | Якуб Колас |
| 5.  | “Добры хлопец Дзік” | Максім Лужанін |

**Заданне 9.**
Пісьменнік – Якуб Колас
Месца – горад Мінск

**Літаратура**

Жуковіч М. В., Праскаловіч В. У., Цітова Л. К. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 5 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 частках. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2021.

ИЗДАТЕЛЬСКИЙ ДОМ ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ ПРЕССА